*Ю.Г.БОЛАТАВА*

# АДЛЮСТРАВАННЕ АДНОСІН ПАМІЖ ДЗЕЦЬМІ І ДАРОСЛЫМІ Ў БЕЛАРУСКІХ ПРЫКАЗКАХ І ПРЫМАЎКАХ: НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ КУЛЬТУРНАЙ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

Для традыцыйнай культуры (у тым ліку і беларускай) характэрна суіснаванне “амбівалентных паняццяў” (М.Бахцін). Прыкладам такой амбівалентнасці ў фальклоры з’яўляюцца апазіцыі накшталт *добры – дрэнны, гаспадарлівы – няўмека, мужчынскае – жаночае, дзіця, якое мае бацькоў, – сірата, роднае дзіця – пасынак, працавітасць – лянота* і інш. Адной з паказальных апазіцый з`яўляецца пара "малы – стары". У фальклоры гэтыя паняцці, з аднаго боку, проціпастаўляюцца, а з другога – дыялектычна звязаны паміж сабой. У дадзеным артыкуле мы спрабуем асэнсаваць нацыянальна-гістарычныя асаблівасці адносін паміж дзецьмі і дарослымі на падставе аналізу прыказак і прымавак Лагойшчыны са збору А.Варлыгі. А.Варлыга (Гладкі Язэп Адамавіч, 1890–1972) – вядомы даследчык культурнага жыцця Лагойшчыны канца XIX – пачатку XX ст. Мы выкарысталі выданні "Прыказкі Лагойшчыны" і «Дадатак да "Прыказак Лагойшчыны"» назвагага аўтара.

Для апісання мадэлі паводзін паміж бацькамі і дзецьмі часта выкарыстоўваюцца метафары. Бацькі асэнсоўваюцца як "карэнне", "куст" (падабенства чалавечых адносін на адносіны ў раслінным свеце), іншы раз бацька называеццца пастухом (сувязь са светам жывёл), а дзеці адпаведна – плод, парастак ці чарада, якая патрабуе дагляду.

Ініцыятыўнымі і дамінуючымі асобамі ва ўзаемаадносінах бацькоў і дзяцей, мяркуючы па захаваным матэрыяле, былі, безумоўна, бацькі ("Не вучы старога ката смятану злізваць"). Чаму склалася менавіта такая мадэль адносін? Прычыны гэтага раскрываюцца ў фальклорных крыніцах: па-першае, дарослыя больш вопытныя ("Як ідзе арэнда, дык сын каменда, а як падыходзіць рата, дык глядзі ты, тата"). Па-другое, дарослыя больш старанныя, працавітыя і гаспадарлівыя ("Бацька збіраў войкаючы, а сын пускае гойкаючы").

Дзеці з`яўляюцца своеасаблівым працягам бацькоў, іх вартасцей і недахопаў ("Сава не родзіць сокала"); пры гэтым "адных бацькоў дзеці, ды няроўныя". Шмат прыказак прысвечаны адносінам маці і дзіцяці. Маці належыць вядучая роля ў выхаванні дзяцей ("Якая матка, такое і дзіцятка"), асабліва ў выхаванні дачок, якія капіруюць мадэль паводзін маці ("Які свердзел, такая і дзюрка, якая матка, такая і цурка"). Значна менш прыказак прысвечаны адносінам бацькі і сыноў ("Якое дрэва, такі і клін – які бацька, такі і сын"). Маці адносіцца да дзяцей з пяшчотай, адзначаецца роўная любоў маці да ўсіх сваіх дзяцей ("У сваёй маткі ўсе добрыя дзіцяткі"). Але і ў адной маці дзеці бываюць розныя ("Адной маткі дзеткі, ды неаднолькавыя песні пяюць"). Любоў маці безаглядная, яна разам са сваімі дзецьмі,якімі б яны ні былі ("І сава сваіх дзетак хваліць: пузаценькія, рылаценькія, зіркаценькія"). У адносінах маці з дзецьмі пануе шчырасць ("Кожная матка сваіх дзяцей не абмане"). Дзеці заўсёды застаюцца дзецьмі для сваіх бацькоў, пры гэтым "малыя дзеці – галава баліць, вырастуць – сэрца". У асноўным адносіны дзяцей да старэйшых і бацькоў паважлівыя ("Хоць ты і лыкам шыт, але мой бацька быў"). Разам з тым адзначым цікавы факт: існуе шэраг прыказак і прымавак пра адваротнае. Дарослыя дзеці часта крыўдзілі сваіх састарэлых бацькоў; у народзе казалі: "Дзяціны хлеб горак".

Вялікі пласт прыказак і прымавак прысвечаны выхаванню дзяцей. Асаблівая ўвага надавалася працавітасці. Калі падлетак быў няўмекай, аб ім гаварылі з пагардай: “Не рабіці, не прыбіці”. Выхоўваліся паслухмянасць і лагоднасць (“Пакорнае цяля дзве маткі сасе, а гордае – ніводнай”). Прапаноўвалася задавальняцца малым (амаль як ва ўсходніх культурах) і быць непераборлівым (у пераносным сэнсе: “Хоць якая папа, абы не гуляла лапа”). Пачынаць выхаванне трэба як мага раней: “Тады дзіця трэба вучыць, як ўпоперак лаўкі ляжыць”. Бытаваў і іншы варыянт гэтай прыказкі: “Тады дзіця трэба біць, як перак лаўкі ляжыць”. Выхаванне – нялёгкі працэс, які доўжыцца на працягу ўсяго жыцця (“Як пайшло з рання, дык ідзе аж да вечара”). Да дзяцей як да адносна самастойных асоб адносіліся пачынаючы з шасці гадоў: “Дзіця трэба год качаць, як яечка, і пяць гадоў пасціць, як авечку”. Галоўным прынцыпам выхавання выступаў тэзіс: “Як гукнеш, гэтак і адгукнецца”. Дарослыя пры дзецях павінны паводзіць сябе стрымана, не гаварыць непрыстойнасцей, падаючы малодшым добры прыклад (“Досыць блазнаваць, калі сталі і дзеці ўзнаваць”).

Сярод дзіцячых вобразаў у фальклоры адзначаецца вобраз сіраты. Пры гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

процiпастаўляюцца дзецi, якiя маюць бацькоў, i дзецi-сiроты. Падкрэслiваецца дагледжанасць дзяцей, што жывуць з бацькамi ("У каго матка – у таго галоўка гладка"). Нешчаслiвы i шматпакутны лёс сiраты: "Дзе ж сiраце бацьку браць?", "Нiхто не бача, як сiрата плача". Будучае сiраты бачылася таксама цяжкiм ("Сiрата – вечная дурата"), бо сiрату няма каму навучыць, адукаваць, прыахвоцiць да добрых паводзiн. Неадназначным было ў сям`i стаўленне да дзяцей–пасынкаў з тае прычыны, што яны часта не слухаюць прыёмных бацькоў ("Не дай Бог чужымi дзецьмi пасылаць").

Засяродзiм увагу на адносiнах да старых людзей. Адносiны да iх былi неадназначнымi. Павага да старэйшых, да прыкладу, адлюстравана такiм чынам: "Не плюй у стары калодзеж, бо можа прыдзецца калi з яго вады напiцца". Сустракаюцца i такiя прыказкi, дзе малым i маладым аддаецца яўная перавага перад старэйшымi ("Калi валiцца малы, дык Бог падкiдае падушачку, а калi стары валiцца, дык Бог падкiдае барану"). Малое дзiця знаходзiцца пад аховай Бога i людзей, бо яму трэба вырасцi i зрабiць шмат карыснага. Кажучы пра старых, адзначалi, што жывым патрэбныя жыццёвы вопыт старых людзей, iх пасiльная дапамога па гаспадарцы i ў выхаваннi малых, уменне спрыяць спакою ў сям`i ("Стары з мусту, а без яго пуста"). У той жа час старасць часта разглядалася не толькi як час адкрыцця жыццёвай мудрасцi i перадачы вопыту нашчадкам, што характэрна для пераважнай большасцi традыцыйных грамадстваў, але i як перыяд у жыццi, дзе мала радасцi: "Старасць – не радасць i горб – не карысць". Адзначалi, што не ўсе старыя людзi мудрыя, высокамаральныя i спагадлiвыя ("Хоць i сто лет, але сораму нет").

Падвядзем вынiкi. Традыцыйная беларуская культура з`яўлялася культурай постфiгуратыўнай (М.Мiд), з дамiнаваннем старэйшых над малодшымi, дзе бацькi навучалi дзяцей. Прычым беларускую культуру мы з большай верагоднасцю можам аднесцi да матрыярхальнага тыпу культуры (Я.Бахофен), бо тут роля мацi значна пераважала ролю бацькi ў выхаваннi дзяцей; дзецям прывiвалiся якасцi, якiя традыцыйна лiчацца жаночымi (напрыклад, лагоднасць, пакорлiвасць).

Цiкава, што фiгура дарослага дамiнавала не толькi над дзецьмi, але i над старымi. I дзяцей, i старых характарызуе залежнасць ад iншых людзей (дзiцяцi – ад бацькоў, старога – ад дарослых дзяцей). Фiгура самастойнага дарослага ў фальклоры заўсёды суправаджае дзiця i старога. Адносiны памiж дарослымi, з аднаго боку, i дзецьмi i старымi, з другога – не раўнапраўныя: гэтыя стасункi лепш за ўсё адлюстроўвае бiнарная апазiцыя *вялiкi–малы*. Узаемаадносiны памiж пакаленнямi ў традыцыйнай сям`i апiсваюцца ў прыказках непасрэдна, праз паняццi *малы–стары*, а таксама апасродкавана, праз паняццi *радзiны–смерць*, *стары–новы*, *рана–позна*. Так, паняццi *радзiны* i *смерць* часта сустракаюцца ў адным сэнсавым радзе ("Смерць i радзiны не глядзяць добрай гадзiны"), адзначаючы выпадковасць, непадуладнасць волi чалавека ў тым i другiм выпадку. Прыведзеныя прыклады падкрэслiваюць падабенства стану дзiцяцi i старога (народжанага i пражыўшага шмат) у традыцыйнай сям`i i супрацьпастаўленне гэтых фiгур фiгуры дарослага.

Як ужо сказана вышэй, у фальклорных крынiцах адзначаецца вялiкая павага дзяцей да бацькоў, але ў тых жа крынiцах гаворыцца пра тое, што, калi дзецi вырастаюць, яны пачынаюць са знявагай адносiцца да састарэлых бацькоў. Чаму так атрымлiваецца? Часам у прыказках сустракаецца, наогул, амаль фрэйдаўскi матыў бацьказабойства: прыгадаем мадэль паводзiн, якая адлюстроўваецца ў некаторых беларускiх казках (напрыклад, казка "Стары бацька"), калi дзеда, як непатрэбнага для маладой сям`i, заводзiлi далёка ў лес i пакiдалi. На наш погляд, адносiны да старых можа растлумачыць наступная прыказка: "Новая сiтца на калочку вiсiць, а старая пад лаўкай валяецца". У беларускiм фальклоры часта пераклiкаюцца паняццi "дзiця–стары", "раннi–позні", "новы–стары", "прыгожы–непрыгожы", у вынiку чаго атрымлiваецца перанос значэння (напрыклад, новага i прыгожага) у адносiнах да рэчаў на адносiны да людзей. Таму стары чалавек разумеецца як непрыгожы, няварты. Магчыма, тут таксама дзейнiчае закон "як гукнеш, гэтак i адгукнецца", бо постфiгуратыўная культура мае i адваротны бок: як у свой час дарослыя дамiнавалi над дзецьмi, так i дзецi, якiя выраслi, захацелi "аддзякаваць" бацькам залiшнiм дамiнаваннем i нават знявагай.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ